# § 45. Рэфармацыйны рух і Контррэфармацыя ў ВКЛ

МІКАЛАЙ РАДЗІВІЛ ЧОРНЫ
ОРДЭН ЕЗУІТАЎ ПАВЕЛ З ВІЗНЫ
КАЛЬВІНІЗМ ІГНАСІА ЛАЁЛА
КОНТРРЭФАРМАЦЫЯ ПРАТЭСТАНТЫЗМ
ВАСІЛЬ ЦЯПІНСКІ ЛЮТЭРАНСТВА
СЫМОН БУДНЫ

Калі хрысціянская вера была прынята на беларускіх землях?

**1. Канфесійная сітуацыя ў ВКЛ у пачатку XVI ст.** Пачатак Новага часу ў ВКЛ адзначыўся сур'ёзнымі зменамі ў рэлігійным жыцці. Акрамя традыцыйных кірункаў хрысціянства з'явіліся новыя — лютэранства, кальвінізм і антытрынітарызм.

На працягу XVI ст., калі глядзець на колькасць вернікаў, прыходаў і епархій, праваслаўная царква па-ранейшаму дамінавала ў дзяржаве. Многія магнаты працягвалі прытрымлівацца праваслаўнай веры і актыўна падтрымлівалі сваю царкву.

**Праваслаўная царква ў ВКЛ у пачатку XVI ст.**

Праваслаўная царква ўсё гэтак жа адыгрывала значную ролю ў духоўным і сямейным жыцці беларускага насельніцтва, але яе ўплыў на палітычнае жыццё дзяржавы ўсё меншаў. Праваслаўныя епіскапы, у адрозненне ад каталіцкіх біскупаў, адсутнічалі ў Радзе ВКЛ, праваслаўныя феадалы мелі абмежаваны доступ да вышэйшых дзяржаўных пасад. Гэта прывяло да паступовага навяртання часткі знаці ў каталіцтва (Міхал Глінскі, Геранім Хадкевіч і інш.).

**Каталіцкая царква ў пачатку XVI ст.**

Каталіцкая царква да пачатку XVI ст. ужо мела дастаткова моцныя пазіцыі, якія падтрымлівала дзяржаўная ўлада. Ад 1385 г. вялікія князі былі

З якімі падзеямі звязана пашырэнне каталіцтва на тэрыторыі Беларусі?

выключна каталікамі. Матэрыяльнае становішча каталіцкай царквы было трывалае дзякуючы ахвяраванням вялікага князя. У сярэдзіне стагоддзя каталіцкая царква пераўзышла праваслаўную зямельнымі ўладаннямі. У сацыяльным плане каталіцтва было пашырана сярод вышэйшых пластоў феадальнага саслоўя, геаграфічна — у Літве, заходніх і цэнтральных раёнах Беларусі.

**Рэфармацыйны рух на тэрыторыі Беларусі**

Рэфармацыйны рух, які з 1517 г. пачаў хутка пашырацца ў краінах Еўропы, у сярэдзіне XVI ст. дасягнуў тэрыторыі Беларусі. Гэтаму працэсу спрыяў эканамічны ўздым, развіццё эканамічных і культурных сувязей ВКЛ з еўрапейскімі краінамі. Першымі носьбітамі рэфармацыйных ідэй на тэрыторыі Беларусі былі як іншаземцы, так і выхадцы з ВКЛ, якія атрымалі адукацыю ў еўрапейскіх універсітэтах. Развіццё кнігадрукавання і пераклад рэлігійных тэкстаў на старабеларускую мову значна дапамаглі пашырэнню ідэй Рэфармацыі ў грамадстве. Прыхільнікі гэтага руху — пратэстанты — выступілі з рэзкай крытыкай каталіцкай царквы. Пратэстанцкія прапаведнікі мелі добрую адукацыю, многія былі выпускнікамі еўрапейскіх універсітэтаў. Найбліжэйшым цэнтрам гуманістычнай думкі для жыхароў ВКЛ быў Кракаўскі ўніверсітэт, дзе атрымалі адукацыю Францыск Скарына і вядомыя беларускія дзеячы Рэфармацыі Сымон Будны і Пётр з Ганёндза.

Растлумачце паняцце «пратэстантызм» і назавіце яго асноўныя кірункі ў Еўропе.

У якой краіне паўстаў рэфармацыйны рух і з чыім імем ён быў звязаны?

Каталіцкая і праваслаўная цэрквы не былі гатовыя супрацьстаяць актыўнай дзейнасці пратэстанцкіх прапаведнікаў і пачалі траціць свой уплыў.

**Асаблівасці Рэфармацыі ў ВКЛ**

**2. Асаблівасці і кірункі Рэфармацыі ў ВКЛ.** Рэфармацыя ў ВКЛ была шчыльна звязаная з Рэнесансам і з'яўлялася складнікам еўрапейскага рэфармацыйнага руху. Аднак у ВКЛ яе ідэі атрымалі пашырэнне ў першую чаргу сярод феадалаў (у адрозненне ад Заходняй Еўропы, дзе ідэі Рэфар-




мацыі пашыраліся сярод мяшчан і сялянства). Яшчэ адной асаблівасцю Рэфармацыі ў ВКЛ быў актыўны ўдзел у пратэстанцкім руху праваслаўнай шляхты.

**Лютэранства на тэрыторыі Беларусі**

Першымі пратэстантамі ў ВКЛ былі прапаведнікі ідэй М. Лютэра, якія хутка пашыралі сваё вучэнне сярод нямецкага насельніцтва гарадоў. У 1535 г. праваслаўны князь Юрый Алелькавіч выдзеліў участак зямлі для будаўніцтва лютэранскай царквы ў Слуцку. Тым не менш гэты кірунак рэфармацыйнага руху не атрымаў значнага пашырэння на беларускіх землях. Лютэранства вызнавалі ў асноўным мяшчане замежнага паходжання, галоўным чынам у Жамойці. Куды большую папулярнасць сярод феадалаў атрымаў кальвінізм, паслядоўнікаў якога называлі «евангелістамі». Апроч рэлігійных матываў, для феадалаў ВКЛ кальвінісцкая Рэфармацыя была сродкам палітычнага дыстанцыявання ад Польшчы, асабліва пасля заключэння Люблінскай уніі.

У пашырэнні кальвінізму знаць пабачыла магчымасць аслабіць уладу манарха, а таксама пашырыць свае матэрыяльныя рэсурсы за кошт маёмасці каталіцкай царквы.

**Кальвінізм на тэрыторыі Беларусі**

У 1553 г. у Брэсце Мікалаем Радзівілам Чорным была заснавана першая ў ВКЛ кальвінісцкая абшчына.



*Катэхізіс С. Буднага. Нясвіж. 1562 г.*

Праз чатыры гады ў Вільні адбыўся першы з’езд «евангелістаў», быў заснаваны кальвінскі збор (царква), арганізавана Літоўская кальвінісцкая губерня. Магнат пачаў укараняць новае вучэнне на падкантрольных яму землях, перадаючы цэрквы і касцёлы кальвінісцкім прапаведнікам. Для прапаганды рэфармацыйных поглядаў пры яго падтрымцы былі заснаваныя тыпаграфіі ў Нясвіжы і Брэсце. У **1562 г.** у Нясвіжы Сымон Будны выдаў «Катэхізіс» на старабеларускай мове.

## ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ



*1. Даведайцеся, хто з дзеячаў Рэфармацыі ўвасоблены на помніку 1000-годдзю Брэста.*
*2. Растлумачце, чаму ён трымае ў руках кнігу.*
*3. Знайдзіце тры цікавыя факты пра гэтую гістарычную асобу і дайце ацэнку яе грамадска-палітычнай дзейнасці.*

*Помнік 1000-годдзю г. Брэста*

Неўзабаве з каталіцызму ў кальвінізм перайшлі буйны́я палітычныя дзеячы краіны Мікалай Радзівіл Руды, Ян Кішка, з праваслаўя — Астафій Валовіч, Юры Зяновіч, Васіль Тышкевіч і інш. Пры іх падтрымцы ў многіх гарадах Беларусі былі арганізаваныя кальвінісцкія абшчыны з малітоўнымі дамамі, школамі, бальніцамі, тыпаграфіямі. Пашырэнне кальвінізму сярод магнатаў і шляхты зрабілася настолькі значным, што ў 1569 г. большасць паноў-рады ВКЛ былі прыхільнікамі Рэфармацыі. Дзякуючы намаганням пратэстанцкай знаці ў 1573 г. быў прыняты Акт Варшаўскай канфедэрацыі, які абвясціў свабоду веравызнання для знаці Рэчы Паспалітай. Пазней гэты дакумент быў уключаны ў Статут 1588 г.

## ПЛЫНІ АНТЫТРЫНІТАРЫЗМУ

**Памяркоўная**
(рэфармаванне грамадства)

Прызнавалі сацыяльныя праблемы, аднак абаранялі дзяржаўны лад, бо лічылі, што змены ў грамадстве маюць адбывацца паступова

*Сымон Будны, Васіль Цяпінскі*

**Радыкальная**
(усеагульная роўнасць)

Крытыкавалі феадальнае грамадства, выступалі супраць дзяржаўнай улады, патрабавалі адмены прыгоннага права і спынення войнаў

*Селянін Пётр з Ганёндза, Якуб з Калінаўкі, былы святар Марцін Чаховіц*



*Помнік Сымону Буднаму і Васілю Цяпінскаму. Мінск*



*Трактат Пятра з Ганёндза аб св. Тройцы*

### Антытрынітарызм

У 1562–1563 гг. адбыўся раскол кальвінісцкай царквы — узнікла плынь, якую называюць антытрынітарызмам. Прыхільнікаў гэтага вучэння, якое адмаўляла веру ў Тройцу і прызнавала Бога строга адзіным, часта называлі «арыянамі». Антытрынітарыі сурова крытыкавалі каталіцкую царкву і актыўна патрабавалі сацыяльных і эканамічных пераўтварэнняў, дзякуючы чаму набылі папулярнасць сярод нізоў мяшчан і невялікай часткі шляхты. Цэнтрамі арыянства ў Беларусі былі Іўе, Лоск, Любча, Навагрудак, Клецк. Абаронцам антытрынітарыяў у ВКЛ зрабіўся магнат Ян Кішка. Аднак сярод прыхільнікаў новай плыні не было адзінства.

### Вынікі Рэфармацыі ў ВКЛ

У другой палове XVI ст. у ВКЛ дзейнічала каля 200 кальвінісцкіх, 10 лютэранскіх і каля 20 арыянскіх абшчын. Пратэстанцкія абшчыны былі створаны ў асноўным на літоўскіх землях, у Падляшшы, паўночна-заходняй і цэнтральнай Беларусі.

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ




*Слуцкая гімназія. Паштоўка. Пачатак XX ст.*

У пачатку XVII ст. па даручэнні Януша Радзівіла пры кальвінісцкім храме ў Слуцку была адкрыта найстарэйшая кальвінісцкая школа на тэрыторыі Беларусі. Адным з рэктараў быў Рэйнгольд Адамі. Па яго падручніку рыторыкі вучыўся М. В. Ламаносаў, які пазней рэгламентаваў дзейнасць рускіх гімназій. У Статуце Слуцкай [кальвінісцкай] школы гаворыцца: «…няхай нікога не адверне ад нашага парога разыходжанне ў рэлігіі, няхай нікога не адарве ад уладання дасяжным шчасцем праз беспадстаўны страх. Мы ўжо даўно навучаны досведам, што рэлігія — прадмет перакanання, а не гвалту».

*Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся:*

1. *Чаму кальвінісцкая навучальная ўстанова заваявала вядомасць як «Слуцкія Афіны»?*
2. *Які прынцып навучання прадстаўлены ў Статуце Слуцкай школы?*
3. *Хто мог вучыцца ў гэтай навучальнай установе і якія прадметы вывучалі вучні кальвінісцкай школы?*
4. *Якія элементы класна-ўрочнай сістэмы ўжываліся ў Слуцкай гімназіі?*

Да эвалюцыйнага руху далучыліся многія магнаты ВКЛ (Радзівілы, Сапегі, Хадкевічы і інш.), якія імкнуліся захаваць незалежнасць княства. Рэфармацыя спрыяла пашырэнню асветы і дабрачыннасці ў грамадстве, актывізацыі духоўнага жыцця, пашырэнню культурных кантактаў з еўрапейскімі краінамі, узбагачэнню беларускай культуры новымі дасягненнямі. У сваю чаргу, беларускія пратэстанцкія мысляры таксама ўзбагацілі агульнаеўрапейскую філасофскую і грамадска-палітычную думку.

Значная частка беларускага сялянства засталася ўбаку ад рэфармацыйных працэсаў, верная праваслаўнай царкве.

**3. Контррэфармацыя ў ВКЛ.** Хуткае пашырэнне Рэфармацыі і павелічэнне колькасці яе паслядоўнікаў сур'ёзна ўсхвалявалі каталіцкую царкву. У 1564 г. вялікі князь Жыгімонт II Аўгуст прызнаў рашэнні Трыдэнцкага сабору каталіцкай царквы, пасля чаго ў **1569 г.** у Вільню прыбылі першыя езуіты, якія зрабіліся галоўнымі прапаведнікамі Контррэфармацыі.

У адрозненне ад краін Заходняй Еўропы, дзе Контррэфармацыя праводзілася жорсткімі метадамі, у ВКЛ яна мела мякчэйшыя формы. Асаблівасцю гэтага працэсу ў Вялікім Княстве Літоўскім зрабілася тое, што ён быў скіраваны не толькі супраць пра-

Успомніце, што такое Контррэфармацыя. Якія былі яе прычыны?

Кім і калі быў заснаваны ордэн езуітаў? Якія былі яго мэты і метады дзейнасці?




*Рэфармацыйны рух у ВКЛ*

У якіх рэгіёнах Беларусі пашырыліся пратэстанцкія вучэнні? Як вы лічыце, чаму?

тэстантаў, але і супраць праваслаўных. З дапамогай Контррэфармацыі польскія духоўныя і свецкія ўлады імкнуліся ўмацаваць палітычнае і дзяржаўнае адзінства Рэчы Паспалітай, згуртаваўшы насельніцтва вакол каталіцкай царквы.

**Асаблівасці Контррэфармацыі ў ВКЛ**

У перыяд праўлення Стэфана Баторыя працэс Контррэфармацыі актывізаваўся. У 1579 г. была адкрытая Віленская езуіцкая акадэмія, годам пазней — езуіцкі калегіум у Полацку, а ў 1585 г. — у Нясвіжы. Езуіты імкнуліся выціснуць сваіх канкурэнтаў з інтэлектуальнай прасторы і ўзяць пад кантроль адукацыю, навуку, мастацкую культуру і духоўнае жыццё. З гэтай мэтай яны дабіліся закрыцця шэрагу пратэстанцкіх школ і тыпаграфій, знішчылі забароненыя рымскімі пáпамі кнігі.

Контррэфармацыя ў ВКЛ набыла асабліва шырокі размах у часы праўлення караля Жыгімонта III Вазы. Манарх актыўна падтрымліваў будаўніцтва новых касцёлаў, манастыроў і калегіумаў, адначасова намагаючыся перашкодзіць будаўніцтву храмаў іншых канфесій. У 1647 г. у Рэчы Паспалітай былі закрытыя ўсе арыянскія школы і тыпаграфіі, а ў наступным годзе арыяне былі выгнаны з краіны.

Растлумачце, чаму караля Жыгімонта III Вазу называлі «езуіцкім каралём».

Контррэфармацыя ў ВКЛ негатыўна адбілася не толькі на мясцовым пратэстанцкім руху, але і на становішчы праваслаўнай царквы. Многія прадстаўнікі беларускай праваслаўнай арыстакратыі паступова перайшлі ў каталіцызм.

Галоўным вынікам Контррэфармацыі ў Вялікім Княстве Літоўскім было звужэнне свабоды веравызнання, усталяванне дамінуючага становішча каталіцкай царквы ў палітычным, культурным і духоўным жыцці, што спрыяла пераходу шляхты з пратэстантызму і праваслаўя ў каталіцызм. Ішоў паступовы працэс паланізацыі і адрыву шляхты ад традыцый свайго народа.

*Асноўнымі рэфармацыйнымі плынямі ў ВКЛ былі кальвінізм, лютэранства, антытрынітарызм. Шырокія народныя масы абыякава ставіліся да Рэфармацыі, таму рэлігійны рух у Беларусі не набыў такога размаху, як у Еўропе. Да сярэдзіны XVII ст. Контррэфармацыя перамагла. Пазіцыі каталіцкай царквы ў палітычным, культурным і духоўным жыцці грамадства ўзмацніліся.*

| **калі ў свеце…** | **на тэрыторыі Беларусі…** |
|---|---|
| 24 жніўня 1572 г. — Варфаламееўская ноч у Францыі | 1563 г. — прывілей Жыгімонта II Аўгуста аб ураўнаванні ў правах усёй шляхты незалежна ад веравызнання |

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Назавіце асаблівасці і кірункі Рэфармацыі ў Беларусі.
2. Складзіце параўнальную табліцу «Рэфармацыя ў Заходняй Еўропе і ў Беларусі» паводле самастойна абраных крытэрыяў.
3. Параўнайце Контррэфармацыю ў ВКЛ і краінах Заходняй Еўропы. Вылучыце агульныя і адметныя рысы.
4. Складзіце схему або ментальную карту «Галоўныя вынікі Рэфармацыі і Контррэфармацыі».